УДК 930. 1(476)”1921/39”

***Аляксандр Аляксандравіч Савіч***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Alyaksandr Savich***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of History of Slavic Peoples*
*Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: uleks@tut.by

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ Ў 1920-я – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ 1950-х гг. АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ КАНФЕСІЙНАЙ ГІСТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг.

*Разглядаюцца накірункі асэнсавання працэсу даследавання і асвятлення канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. На падставе шырокага кола разнастайных крыніц як апублікаваных, так і архіўных матэрыялаў, прадстаўлены арганізацыйна-метадалагічныя і крыніцазнаўчыя паказчыкі гістарыяграфічнага працэсу, выяўлены ідэйна-палітычныя і праблемна-тэматычныя прыярытэты станаўлення і развіцця ў перыяд 1920-х – першай паловы 1950-х гг. айчыннай гістарыяграфічнай традыцыі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі. Зроблена выснова аб абумоўленасці навукова-даследчыцкай і выдавецкай дзейнасці дзяржаўна-палітычнымі і ідэйна-прапагандысцкімі патрэбамі савецкай улады, якая выкарыстоўвала канфесійную тэматыку для пацвярджэння акупацыйна-паланізацыйнай палітыкі Польшчы і выхавання грамадскай свядомасці ў духу рэвалюцыйнага змагання за Заходнюю Беларусь. Абумоўленасць даследаванняў марксісцка-ленінскімі атэістычнымі прыярытэтамі абмяжоўвала даследчыкаў і не садзейнічала прадметнай распрацоўцы канфесійнай гісторыі краю.*

## Formation and Development of 1920s – First Half of the 1950s of the Internal Historiography of the Confessional History of Western Belarus

*The purpose of the article is to study the process of studying and covering the confessional history of Western Belarus 1921–1939. Based on a wide range of different sources of both published and archival materials, organizational, methodological and source study indicators of the historiographic process are presented, ideological, political and problem-thematic priorities of the period of formation and development in the period of the 1920s – the first half of the 1950s Belarusian historiographical tradition of the confessional history of Western Belarus. It was concluded that the research and publishing activities were determined by the state-political and ideological-propaganda needs of the Soviet government, which used confessional themes to confirm the occupation policy of Poland and to raise public awareness in the spirit of the revolutionary struggle for Western Belarus.*

## Уводзіны

Характэрнай асаблівасцю айчыннай гістарычнай навукі перыяду Рэспублікі Беларусь стала істотная ўвага да гісторыка-навуковай праблематыкі, у тым ліку праблемнай гістарыяграфіі. Гэта пацвярджаецца і на прыкладзе гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг., у прыватнасці канфесійнай гісторыі краю [1, с. 8–10]. Намаганнямі сучасных айчынных даследчыкаў А. М. Вабішчэвіча, С. Ф. Верамеева, Т. В. Лісоўскай, А. М. Свірыда, А. Г. Цымбала і іншых аўтараў створана дастаткова аб’ектыўная версія айчыннай гістарыяграфіі праблемы з прадстаўленнем асноўных эмпірычных паказчыкаў фарміравання айчыннай гістарыяграфічнай традыцыі адлюстравання канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі ў складзе міжваеннай Польшчы [2–6]. Аднак пры гэтым характэрнай асаблівасцю названых даследаванняў з’яўляецца недастатковая ўвага да перыяду 1920-х – першай паловы 1950-х гг., калі адбывалася станаўленне і развіццё беларускай гістарыяграфіі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі. Разам з гэтым у некаторых публікацыях назіраецца беспадстаўнае адасабленне храналагічных адрэзкаў: 1920–30-я гг. і 1940-я – першая палова 1950-х гг., якія ў арганізацыйна-метадалагічным і праблемна-тэматычным планах не выяўляюць істотнай дыскрэтнасці і складаюць змест першага перыяду айчыннай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі [1, с. 10].

Мэта артыкула – рэканструкцыя і інтэрпрэтацыя працэсу навуковага асэнсавання і адлюстравання ў 1920-х – першай палове 1950-х гг. айчыннымі даследчыкамі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.

**Ідэйна-палітычныя і праблемна-тэматычныя прыярытэты айчыннай гістарыяграфіі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.**

Вызначальным фактарам грамадска-палітычнага жыцця міжваеннай Польшчы і Заходняй Беларусі было рэлігійнае пытанне і канфесійныя адносіны. Ва ўмовах адроджанай у 1918 г. Польшчы адпаведныя аспекты функцыянавання розных рэлігійных абшчын былі своеасаблівым маркерам палітычнай дабрачыннасці і схільнасці да наладжвання канструктыўнага дыялогу, накіраванага на ўсталяванне міжканфесійнага міру і згоды. Рэзкае змяненне статусу дзвюх асноўных канфесій на тэрыторыі Заходняй Беларусі (праваслаўя і каталіцызму) у выніку дзяржаўна-палітычных трансфармацый пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі прыводзіла да абвастрэння этнаканфесійных адносін і ўздымала рэлігійную тэматыку на вышэйшыя ступені абмеркавання розных урадавых, грамадска-культурных, палітычных структур. У цэлым можна гаварыць пра справядлівасць замацаванай у айчыннай гістарыяграфіі думкі пра тое, што ўлады новаўтворанай Польшчы, імкнучыся максімальна аслабіць праваслаўную царкву як апору руска-праваслаўнага панавання, не асабліва стрымлівалі яго апанентаў у жаданні аслабіць і матэрыяльна-фінансавыя магчымасці праваслаўя ў ходзе распачатай рэвіндыкацыі. Імкнучыся абмежаваць падтрымку і ўмацаванне руска-праваслаўнага ўплыву, польская ўлада пайшла на афармленне аўтакефаліі Польскай праваслаўнай царквы, афіцыйна абвешчанай у 1925 г.

Гэтыя і іншыя падзеі этнакультурнага жыцця краю насцярожвалі кіраўніцтва савецкай краіны, выклікалі заклапочанасць грамадскасці БССР і Заходняй Беларусі, таму маральная падтрымка і спачуванне праваслаўнаму насельніцтву сталі яскравай рысай міжваеннага ідэйна-палітычнага трэнду, які атрымаў сваё асвятленне на старонках айчынных публікацый. З другога боку, у такой сітуацыі каталіцтва як дамінуючая канфесія і адзін з вызначальных атрыбутаў Польшчы ўспрымалася і падавалася ў адмоўных фарбах як адзін з элементаў сістэмы дыскрымінацыі, прыгнёту і паланізацыі.

Кіраўніцтва БССР ва ўмовах барацьбы за «сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» Заходняй Беларусі ажыццяўляла захады па арганізацыі даследаванняў і прэзентацыі заходнебеларускай тэматыкі, вымушана было суадносіць адпаведную ідэйна-прапагандысцкую і навукова-асветніцкую дзейнасць з марксісцка-ленінскімі атэістычнымі прыярытэтамі савецкай улады, таму канфесійная праблематыка ў 1920–30-я гг. не атрымала прадметнага асэнсавання і не сфарміравала самастойнага накірунку айчыннай заходнебеларускай гістарыяграфіі. Тут трэба звярнуць увагу на апрыёрна адзначаную ў некаторых з вышэйназваных даследаванняў ролю Камісіі па вывучэнні гісторыі Заходняй Беларусі Інбелкульта БАН (КВЗБ) у асэнсаванні рэлігійнай тэматыкі, якая патрабуе пацвярджэння.

Сапраўды, істотная роля дадзенай установы ў пастаноўцы канфесійнай тэматыкі, як і ў меншай ступені Заходняга сектару Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (ЗС), пацвярджаецца ў ходзе аналізу іх дзейнасці як спецыфічных па ўскладзеных на іх задачах навуковых устаноў. Яны былі падпарадкаваны Прадстаўніцтву ЦК КПЗБ пры ЦК КП(б)Б як галоўнага асяродка Савецкай Беларусі, які забяспечваў арганізацыю рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі і быў падкантрольным Выканкаму Камінтэрна і ДПУ-НКУС [1, с. 20–21]. Адзначым, што планы і справаздачы навукова-даследчыцкай дзейнасці КВЗБ і ЗС не выяўляюць прадметнай зацікаўленасці гісторыка-рэлігійнай тэматыкай [7–16]. Тым не менш гэта не азначае, што канфесійная фактаграфія зусім не цікавіла прадстаўнікоў навуковай супольнасці спецыялістаў у галіне гісторыі Заходняй Беларусі. У прыватнасці, вядомае дакументальнае выданне КВЗБ «Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм. 1922–1926 гг.» змяшчае інфармацыю аб «рэлігійных праследаваньнях польскіх уладаў» [17, с. 7, 9, 12, 14, 19, 47, 51, 100, 105, 122, 132, 140, 149, 168, 298]. Больш таго, названыя вышэй навуковыя ўстановы пільна сачылі за інфармацыйнай прасторай вакол Польшчы і Заходняй Беларусі, фарміруючы адпаведны масіў разнастайных крыніц, у тым ліку па этнаканфесійнай праблематыцы. У асноўным гэта была інфармацыя, атрыманая з адкрытых польскіх статыстычных крыніц, найперш агульнапольскіх перапісаў. Аднак архівы згаданых устаноў прэзентуюць вялікую колькасць публіцыстычных матэрыялаў з розных як савецкіх, так і замежных, у першую чаргу польскіх перыядычных выданняў [18; 19], а таксама даследаванні сваіх супрацоўнікаў, якія змяшчаюць аналітыка-статыстычныя этнаканфе-

сійныя дадзеныя, што сёння выкарыстоўваюцца як змястоўныя крыніцы [20; 21].

Арганізатары навукова-выдавецкай дзейнасці БССР павінны былі прытрымлівацца марксісцка-ленінскіх сацыяльна-класавых канонаў, накіраваных на нівеліраванне рэлігійных і нацыянальных рысаў і выхаванне атэістычных інтэрнацыяналісцкіх прыярытэтаў, ігнараванне сацыякультурнай дзейнасці прадстаўнікоў розных канфесій, якая не ўпісвалася ў фармат пралетарскай культуры. У выданнях неабходна было дапасоўваць канфесійную сітуацыю ў Заходняй Беларусі да патрэбаў нацыянальна-вызваленчай барацьбы з разлікам на фарміраванне трывалых антыакупацыйных настрояў як падставы для рэвалюцыйнага вырашэння падзеленай краіны. Таму, уздымаючы актуальнае пытанне этнаканфесійнай палітыкі Польшчы, аўтары публікацый мэтанакіравана павялічвалі яе нядобразычлівыя намеры ў дачыненні да праваслаўнай царквы і ўвогуле да беларускага народа, адназначна выстаўляючы ў якасці канчатковай мэты акаталічванне, асіміляцыю і паланізацыю краю [22–24]. З улікам гарантыі роўных правоў для ўсіх рэлігій паводле польскай канстытуцыі сцвярджалася, напрыклад, што ў Заходняй Беларусі «рэлігійнае пытаньне, дзякуючы спэцыфічнай ксяндзоўска-панскай політыцы, набрала шмат вастрыні і напружанасьці», падкрэслівалася неаднолькавае стаўленне польскага ўрада да асобных канфесій, у прыватнасці да праваслаўнай царквы. Гэта пацвярджалася структурай міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы, у якім былі аддзелы рыма-каталіцкі, евангелісцкі і «іншых рэлігій», у кампетэнцыю якога ўваходзілі і справы праваслаўнай царквы, якімі займаліся чыноўнікі неправаслаўнага паходжання. Паводле аўтара, кіраўнік аддзела іншых рэлігій «нейкі Пекарскі, як кажуць, езуіт», які мае заданне «кіраваць справамі праваслаўнай царквы так, каб прынесці ёй адну шкоду і па магчымасьці ліквідаваць яе» [23, с. 40]. Акцэнтацыя на абмежаваннях у дачыненні да праваслаўя, закрыцці цэркваў, штучныя бар'еры пры адкрыцці і рэгістрацыі праваслаўных абшчын, канфіскацыю маёмасці праваслаўных прыходаў і іншыя мерапрыемствы рэвіндыкацыі павінны былі ўзмацніць негатыўнае стаўленне праваслаўнага насельніцтва да польскай улады і каталіцкай царквы як правадніка і выканаўцы асіміляцыйнай польскай палітыкі [22, с. 8–10; 23, с. 40]. Аўтары падкрэслівалі асаблівыя абмежаванні ў дачыненні да праваслаўных святароў, адзінкі якіх выслужыліся «перад польскай адміністрацыяй правакацыйнай дзеяльнасьцю на шкоду беларускаму (і ўкраінскаму) народу» і атрымалі «польскае абывательства». Адзначаючы наяўнасць абмежаванняў у дачыненні да некаталіцкага насельніцтва, падкрэсліваўся і абсалютызаваўся дзяржаўна-палітычны прыярытэт, якім карысталіся каталіцтва і каталікі: «свабода веры ў Польшчы існуе толькі для каталікоў… людзям некаталіцкай веры – будзь то земляроб, настаўнік, інжынэр, гандляр, – усё адно, – жыцьця ў панскай Польшчы няма» [22, с. 40]. У такіх умовах нядзіўна, што каталіцкая царква, як ідэйна-духоўная аснова польскай палітычнай улады, у айчынных аўтараў справядліва атрымлівала ролю ініцыятара і выканаўцы польскай асіміляцыйна-паланізацыйнай палітыкі.

Такіх пазіцый прытрымліваўся і беларускі ксёндз-каталік А. Станкевіч, які ў сваіх публікацыях падкрэсліваў палітычную ролю каталіцкай царквы, адзначаючы яшчэ ў 1921 г., што замест «касцёла каталіцкага ў Віленшчыне і Гродзеншчыне паўстаў і пануе аж да сёння касцёл польскі, установа чыста палітычная, або прадстаўніцтва польскага нацыяналізму ў Заходняй Беларусі» [25, с. 1]. Яго шматлікія працы ілюструюць розныя аспекты гісторыі касцёла ў Заходняй Беларусі на фоне асіміляцыйна-паланізацыйнай палітыкі польскай улады, паказваюць асаблівасці стаўлення каталіцкіх іерархаў да беларускага пытання, беларусізацыю касцёльнага жыцця, дзейнасць беларускіх ксяндзоў і іх пераследы з боку духоўнага начальства і цывільнай улады [26–29].

У публікацыях БССР згадваліся «стараньні абярнуць у фактар спольшчваньня» нават праваслаўную царкву, якая ў асобах сваіх вышэйшых іерархаў «узамен на матар'яльны добрабыт ахвотна йдзе насустрач плянам польскага ўраду». Да здраднікаў інтарэсаў народаў былі аднесены вышэйшыя праваслаўныя іерархі, «пастаўленыя» на адпаведныя пасады польскімі чыноўнікамі, таму аўтарытэт «іх зусім слабы», а праваслаўныя беларусы і ўкраінцы не хочуць прызнаваць іх за сваіх і «проста прагналі б іх вон, як наймітаў польскага ўраду, каб маглі гэта зрабіць» [23, с. 41; 24, с. 16]. Сярод духавенства ўхваляліся тыя, якія смела падымалі свой голас супраць «рэлігійнага

зьдзеку і ўціску», аднак праз некаторы час за сваю смеласць траплялі у турму, а ў лепшым выпадку іх звальнялі з пасады, як, напрыклад, у пачатку 1925 г. толькі на Гарадзеншчыне было звольнена да 50 святароў [23, с. 40]. Пры гэтым, аздабляючы аповяд красамоўнымі прыкладамі ціску польскіх улад на праваслаўных іерархаў, аўтары ілюстравалі неадназначную сітуацыю ў пачатку 1920-х гг., калі ў Польшчы і Заходняй Беларусі служылі прызначаныя Маскоўскім Патрыярхам праваслаўныя іерархі, якія супраціўляліся польскаму ўплыву і аўтакефаліі праваслаўнай царквы ў Польшчы [22, с. 8–9; 23, с. 41; 24, с. 20–21]. Што да аўтакефаліі, то акрамя палітычнага валюнтарызму польскіх улад у яе арганізацыі, паводле выданняў, згода «канстантынопальскага патрыярха» была дасягнута «дзякуючы хабару ў 30 000 франкаў» [24, с. 20].

Фіксуючы негатыўнае стаўленне айчынных аўтараў да падпарадкавання і апалячвання праваслаўнай царквы праз аўтакефалію, фінансаванне яе польскім урадам, перавод набажэнства на польскую мову, адзначым рэдкую для выданняў БССР інфармацыю аб жаданні беларускіх нацыянальна-буржуазных дзеячаў «захапіць праваслаўную царкву ў Польшчы ў свае рукі і зрабіць яе праваднікам сваіх уплываў». Аўтар не хавае свайго задавальнення ад таго, што такія «стараньні (прынамсі ў Зах. Бел.) ня маюць посьпеху. Праўда, у Вільні ёсьць невялікі гурток праваслаўнага духавенства, які сымпатызуе беларускаму нацыянальна-культурнаму руху, але не карыстаецца ўплывамі» [24, с. 21]. Магчыма, мелася на ўвазе згаданае ў 1924 г. паліцыяй «Праваслаўнае філантрапічнае таварыства» як канфідэнцыйная арганізацыя, што атрымлівала «фундуш ад саветаў праз невядомую асобу, якая пражывае ў Вільні, і ад Рускага папячыцельскага камітэта ў Варшаве». Паводле дакумента, у кожным павеце ёсць прадстаўнікі арганізацыі, якія праводзяць антыдзяржаўную агітацыю, іх дзейнасць кантралюецца праз савецкіх дыпламатычных служачых. Старшынёй таварыства названы сенатар В. Багдановіч, сябрамі – Якубоўская, Самахвалаў, У. Самойла (названы як «Самуілаў Уладзімір сын Яна як прадстаўнік партыі расійскіх кадэтаў-манархістаў у Парыжы») і інш. [30, арк. 264]. Верагодна, гаворка ідзе пра арганізацыйныя намаганні праваслаўных беларускіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, якія ў 1927 г. прывялі да стварэння Праваслаўнага беларускага дэмакратычнага аб’яднання.

Франтальны агляд і змястоўны аналіз айчынных публікацый 1920–1930-х гг. запэўнівае ў тым, што характэрнай рысай айчыннай гістарыяграфіі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі з’яўлялася ігнараванне пратэстанцтва і нехрысціянскіх канфесій, у першую чаргу іўдаізму, нягледзячы на вялікі адсотак насельніцтва іўдзейскага веравызнання, а таксама ісламу.

Больш уважлівым было стаўленне ў міжваеннае дваццацігоддзе да гісторыка-канфесійнай праблематыкі ў Польшчы, што пацвярджаецца значнай колькасцю публікацый, якія ў параўнанні з мінімальна-назыўной падачай савецкіх беларускіх выданняў былі больш глыбокімі і шматаспектнымі ў фактаграфічным плане, у тым ліку пры выяўленні нарматыўна-прававых падстаў функцыянавання рэлігійных суполак [1, с. 167]. Іх аўтары, урадоўцы ці блізкія да ўрадавых колаў Польшчы грамадска-палітычныя дзеячы, з пункту гледжання польскай дзяржаўнасці і культурнай традыцыі асвятлялі этнаканфесійныя праблемы Польшчы, а таксама заходнебеларускіх абшараў. На фоне адсутнасці аналагічнай тэматыкі ў айчынным друку адзначым вялікую ўвагу польскіх даследчыкаў у дачыненні да гісторыі пратэстанцкіх згуртаванняў [5, с. 14].

Вызначальныя змены ў развіцці канфесійнай праблематыкі ў другой палове 1940-х – другой палове 1950-х гг. сталі наступствам змянення гістарыяграфічнай сітуацыі ў сувязі са знаходжаннем Польшчы ў складзе сацыялістычнага лагера, што адмоўна ўспрымалася заходнімі краінамі і Ватыканам, які ўзначаліў ідэалогію польскага вызвалення ад камунізму. Пасляваенныя публікацыі дэманструюць паступовае ажыўленне цікавасці да гісторыка-канфесійнай тэмы, выкарыстанне шырокага кола разнастайных крыніц, у першую чаргу архіўных звестак, і павелічэнне аб’ёму і зместу выданняў на падставе марксісцка-ленінскіх падыходаў, у прыватнасці ў вывучэнні каталіцтва ў Заходняй Беларусі. Так, Ц. Гарбуноў запэўніваў у як быццам бы існаваўшай «праграме каталіцкага духавенства», якая мэтанакіравана змешвала рэлігійную прыкмету з нацыянальнай і кожнага каталіка ў Заходняй Беларусі абвяшчала палякам, традыцыйна даводзіў аб імкненні каталіцкага духавенства «ўсімі мерамі» садзейнічаць пілсудчыкам у правядзенні палітыкі адрыву

беларусаў ад братняга рускага народа. Такія намаганні аўтар назваў марнымі, бо «каталіцтва прыняла толькі беларуская шляхта», а «шырокія ж народныя масы вытрымалі гераічную барацьбу і скрозь вякі барацьбы пранеслі сваю родную культуру, сваю мову, свой нацыянальны беларускі лад жыцця. У іх ніколі не згасала імкненне да ўз'яднання з братнім рускім народам» [31, с. 74].

Сацыяльна-палітычная абумоўленасць выяўляецца і ў знакавым даследаванні – першай кандыдацкай дысертацыі В. Панамарэнкі, прадметна прысвечанай канфесійнай праблематыцы Заходняй Беларусі, аснову якой склалі тэзісы аб каланіяльнай палітыцы Польшчы, антынароднай сутнасці каталіцкай царквы і яе арганізацый у Заходняй Беларусі. У даследаванні працягнуты даваенны падыход у падачы каталіцтва як адной з складовых элементаў польскага каланіялізму ў Заходняй Беларусі і яго шчыльнай сувязі і падтрымцы з боку капіталістычных краін і Ватыкана. Падкрэсліваючы варожую класавую сутнасць, даследчыца падала каталіцкі касцёл «дзяржаўнай арганізацыяй», якая актыўна працавала над умацаваннем улады памешчыкаў і капіталістаў і дапамагала ім у правядзенні каланіяльнай палітыкі ў адносінах да народаў няпольскіх нацыянальнасцяў. Найперш гэта тычылася матэрыяльна-фінансавых паказчыкаў, якія мэтанакіравана падводзілі да думкі аб драпежніцкай палітыцы каталіцкай царквы, у той час як, паводле аўтара, на будаўніцтва і рамонт касцёлаў ішлі сотні тысяч злотых, беларускія сяляне вымушаны былі жыць у зямлянках. «Антынародны» статус каталіцкай царквы прадугледжваў і адпаведныя задачы разнастайных арганізацый і таварыстваў. Разам з гэтым выяўляецца нізкі ўзровень разумення сутнасці даследуемых з'яў. Так, В. Панамарэнка, на думку якой кіруючыя колы Польшчы і Ватыкана ў ажыццяўленні сваёй каланіяльнай палітыкі ў Заходняй Беларусі вялікія надзеі ўскладалі на ўніяцкую царкву, не заўважала вядомага антаганізма паміж двума названымі суб'ектамі рэлігійнага жыцця ў дачыненні да распаўсюджвання уніі. Галоўным жа акцэнтам была «антыцаркоўная» барацьба як частка вызваленчага руху насельніцтва на чале з яго авангардам – рабочым класам і КПЗБ [32, с. 5, 7, 9–14].

**Заключэнне**

У 1920-я – першай палове 1950-х гг. адбывалася станаўленне і паступовае развіццё айчыннай гістарыяграфіі канфесійнай гісторыі Заходняй Беларусі на падставе марксісцка-ленінскай парадыгмы і ў адпаведнасці з ідэйна-палітычнымі прыярытэтамі савецкай улады. У 20–30-я гг. ХХ ст. палітычная актуальнасць рэлігійна-канфесійнай праблематыкі ў сістэме грамадска-палітычных і міжнародных адносін патрабавала ад айчынных аўтараў асцярожнасці і вытрымкі пры падачы адпаведных пытанняў. У пераважнай большасці публікацый адсутнічала канфрантацыйная рыторыка ў дачыненні да рэлігіі ў цэлым, што не супадала з актыўнай атэістычнай прапагандай і агрэсіўнымі нападкамі і рэпрэсіямі ў дачыненні да царквы і рэлігійных дзеячаў у СССР. Палітычная сітуацыя ў Заходняй Беларусі як часова акупаваным польскімі захопнікамі этнічным беларускім краі характарызавалася наяўнасцю відавочнага канфлікту паміж новай уладай з яе ідэйным падмуркам – каталіцкай царквой – і мясцовым у пераважнай большасці праваслаўным насельніцтвам і праваслаўнай царквой. Такі стан вымушаў гісторыкаў пазбягаць крытыкі ў дачыненні да праваслаўнай царквы, прадстаўляючы яе як ахвяру польска-каталіцкага гвалту і ціску, разумеючы рызыкоўнасць перанясення агітацыйна-прапагандысцкай рыторыкі савецкай краіны на ідэйна-палітычную сферу Заходняй Беларусі. Савецкім урадавым колам і зацікаўленым ведамствам для замацавання свайго ўплыву на яе тэрыторыі выключна важна было сфарміраваць вобраз Польшчы як вераломнага і нахабнага парушальніка свабоды сумлення і выканання рэлігійных культаў, а СССР і БССР прадстаўляць як абаронцаў праваслаўнага беларускага насельніцтва, якое непарыўным сваім жаданнем імкнецца, у канчатковым варыянце, да аднаўлення рэлігійнага і дзяржаўна-палітычнага адзінства беларускага і рускага народаў. Што да каталіцтва, то яно традыцыйна разглядалася як ідэйная аснова польскай дзяржаўнасці і атрымлівала негатыўныя, асуджальныя фармулёўкі застрэльшчыка акупацыйна-паланізацыйных працэсаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Савіч, А. А. Айчынная гістарыяграфія гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2019. – 320 с.
2. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / А. М. Вабішчэвіч ; БДУ. – Мінск, 2010. – 356 арк.
3. Свирид, А. Н. Униатская церковь в Западной Беларуси (1921–1939 гг.) : монография / А. Н. Свирид. – Брест : БрГУ, 2012. – 218 с.
4. Цымбал, А. Г. Праваслаўная царква ў Заходняй Беларусі (1921–1939) / А. Г. Цымбал. – Мінск : БДЛУ, 2016. – 124 с.
5. Лисовская, Т. В. Неопротестантизм в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Т. В. Лисовская ; НАН Беларуси, Ин-т истории. – Минск, 2009. – 113 л.
6. Веремеев, С. Ф. Отечественная историография истории христианских конфессий в БССР и Западной Беларуси в 20–30-е гг. ХХ в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.09 / С. Ф. Веремеев ; БГПУ им. М. Танка. – Минск, 2014. – 159 л.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 85.
8. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 86.
9. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 1. Спр. 87.
10. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАНБ). – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 262.
11. ЦНА НАНБ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 263.
12. ЦНА НАНБ. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 265.
13. ЦНА НАНБ. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 2.
14. ЦНА НАНБ. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 3.
15. ЦНА НАНБ. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 4.
16. ЦНА НАНБ. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 5.
17. Інтэрпэляцыі беларускіх паслоў у польскі сойм. 1922–1926 гг.: зборнік дакументаў аб панскіх гвалтах, катаваньнях і зьдзеках над сялянамі і рабочымі Заходняй Беларусі / Каміс. па вывучэньні Заходняе Беларусі. – Менск : Белдзяржвыд, 1927. – 496 с.
18. НАРБ. – Ф. 60п. Воп. 3. Спр. 582.
19. НАРБ. – Ф. 325. Воп. 1. Спр. 54.
20. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 7.
21. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 164.
22. Кон, Ф. Западная Белоруссия – колония панской Польши (к процессу над Белорусской Громадой) / Ф. Кон. – М. : Изд-во ЦК МОПР СССР, 1928. – 38 с.
23. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Менск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1926. – 56 с.
24. М. С. Сучасная Польшча і Заходняя Беларусь / М. С. // Заходняя Беларусь : зборнік. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – С. 3–30.
25. Krywičonak, M. Hołas Kryudy / M. Krywičonak // Kryniсa. – 1921. – 9 kras. – S. 1–2.
26. Stankiewicz, A. Rodnaja mowa u swiatyniach / A. Stankiewicz. – Wilnia, 1929. – 192 s.
27. Станкевіч, А. З жыцця і дзейнасці Казімера Сваяка (у дзесятыя ўгодкі яго смерці), 1926–1936 / А. Станкевіч. – Вільня : Калосся, 1936. – 30 с.
28. Станкевіч, А. Хрысціянства і беларускі народ (спроба сінтэзы) / А. Станкевіч. – Вільня : Беларус. катал. выд-ва, 1940. – 181 с.
29. Станкевіч, А. З Богам да Беларусі : зб. тв. / А. Станкевіч ; уклад., навук. рэд., камент., прадм.: А. Пашкевіч, А. Вашкевіч. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2008. – 1098 с.
30. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. – Ф. 2028. Воп. 1. Спр. 71.
31. Горбунов, Т. Воссоединение белорусского народа в едином советском социалистическом государстве / Т. Горбунов. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1948. – 232 с.
32. Пономаренко, В. П. Католическая церковь Западной Белоруссии – орудие колониальной политики буржуазно-помещичьей Польши (1919–1939 гг.) : автореф. дис. …. канд. ист. наук / В. П. Пономаренко ; Моск. гос. пед. ин-т им. В. И. Ленина. – М., 1955. – 15 с.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 14.07.2020*